УДК 930

*І.І. Шаўчук*

# З ГІСТОРЫІ СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

У артыкуле на падставе апублікаваных і не ўведзеных у навуковы абарот архіўных матэрыялаў разглядаецца важнае, з пункту гледжання развіцця навукі і культуры БССР, пытанне аб незавершаных спробах выдання нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі. Упершыню прычынамі няўдач вызначаюцца не толькі і не столькі палітычныя рэпрэсіі, пачатак Вялікай Айчыннай вайны, колькі іншыя фактары, перадусім мэтазгоднасць (матываваная эканамічнымі і палітычнымі прычынамі) яе з'яўлення ў рэаліях 1930-х гадоў.

Сёння і навукоўцам і грамадскасці добра вядомы плён працы выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя». Ёй ужо да другой паловы 1990-х гадоў было здзейснена больш за 500 выданняў. Сярод іх – 18-томная «Беларуская энцыклапедыя», 6-томная «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», 2-томнае «Вялікае княства Літоўскае», энцыклапедычны даведнік «Беларусь», «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» і многае іншае.

Разам з тым, калі нехта зацікавіцца гісторыяй стварэння рэдакцыі Беларускай энцыклапедыі, папярэдніцай якой была «Беларуская Савецкая энцыклапедыя» (БСЭ, БелСЭ), то паўсюдна можа сустрэць вельмі сціслую інфармацыю, якая прыводзіцца ў адпаведных публікацыях. Яна зводзіцца, як правіла, да наступнага: «Выдавецтва Беларуская савецкая энцыклапедыя імя П. Броўкі» створана ў студзені 1967 г. як галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Акадэміі навук БССР на правах навукова-даследчага інстытута. У сістэме дзяржкамвыдата са студзеня 1975 г. У 1980 г.пераўтворана ў выдавецтва, якое захавала функцыйную структуру і статус навуковай установы; ёй нададзена імя заснавальніка і першага галоўнага рэдактара энцыклапедыі народнага паэта Беларусі акадэміка АН БССР П.У. Броўкі» [1]. Некалькі пашырана, але зноў жа з 1967 г., яна акрэсліваецца і ў артыкуле І.П. Хаўратовіча [2], і ў найноўшых выданнях.

Тым не менш згадкі пра даваенныя спробы стварэння нацыянальнай энцыклапедыі ў навуковай літаратуры сустракаюцца. У.М. Міхнюк у 1985 г. адзначаў, што падрыхтоўчая праца па стварэнні БелСЭ разгарнулася з 1932 г. у адпаведнасці з пастановай аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. Ён пісаў пра меркаваны аб'ём у 10 тамоў, пра выпуск «праекта слоўніка па гісторыі Беларусі, гісторыі Расіі, усеагульнай гісторыі». Прычынай спынення працы па выданні энцыклапедыі даследчык лічыў, аднак, пачатак Вялікай Айчыннай вайны [3, с. 70]. Памылковая выснова тлумачыцца, відавочна, часам напісання згаданай працы, калі аўтар не мог, ведаючы архіўны матэрыял (а, як вынікае з манаграфіі, ён яго ведаў), з прычынаў палітычнага характару апублікаваць матывацыю закрыцця рэдакцыі БСЭ, выкладзеную ў рашэннях ЦК КП(б)Б. Разам з тым амаль праз дваццаць пяць гадоў пасля У.М. Міхнюка У. Саламаха ў інтэрв'ю газеце «Звязда» сцвярджае: «Крыўдна, што па розных прычынах, адна з іх вайна…» планы па рэалізацыі БСЭ не ажыццявіліся [4].

Большая ўвага даваенным спробам стварэння нацыянальнай энцыклапедыі нададзена газетным артыкулам у «Советской Белоруссии», які пабачыў свет у 2002 г. Ён утрымлівае значны фактычны матэрыял, а таму добра аргументаваны і цікавы сваёй

фактурай. Гэта не здзіўляе, таму што сааўтарам тут выступае кіраўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь В.Д. Селяменеў [5]. З.В. Шыбека [6, с. 291], магчыма, выкарыстоўваючы даныя гэтага артыкула, і М.П. Касцюк [7, с. 340], грунтуючыся на яго інфармацыі, у сваіх публікацыях таксама надалі некаторую ўвагу дадзенаму аспекту гісторыі навуковага будаўніцтва ў БССР у 1930-я гады.

Калі З.В. Шыбека толькі канстатуе спыненне падрыхтоўкі да друку «10-томнай Беларускай энцыклапедыі (без слова «савецкай» – І.Ш.), якая папулярызавала… «ворагаў народа», то М.П. Касцюк у пятым томе «Гісторыі Беларусі» падрабязней спыняецца на даваенных спробах стварэння БелСЭ. Дарэчы, і газетную, і апошнія дзве публікацыі, незалежна ад іх аб'ёму, аб'ядноўвае аднолькавы падыход у вызначэнні прычын спынення працы па рэалізацыі дадзенага выдання. Усе яны такой прычынай бачаць выключна палітычныя рэпрэсіі ў дачыненні да навукоўцаў увогуле і да супрацоўнікаў рэдакцыі Беларускай савецкай энцыклапедыі ў прыватнасці.

Нам падобнае тлумачэнне не падаецца вычарпальным. Таму, улічваючы напрацоўкі папярэдніх аўтараў і свае ўласныя, уяўляецца магчымым яшчэ раз, з прыцягненнем неапублікаванага архіўнага матэрыялу, звярнуцца да ўзнятага пытання, паколькі яно дазваляе лепш зразумець сучасны стан айчыннай навукі і культуры праз асвятленне перыяду, калі закладаліся іх падмуркі.

Вядома, што наяўнасць нацыянальнай энцыклапедыі, прынамсі ўніверсальнай, з'яўляецца своеасаблівым індыкатарам культурнага і навуковага ўзроўню развіцця кожнага народа. У Расійскай імперыі такія энцыклапедыі ствараліся ў XIX – пач. XX ст. (найбольш буйная і вядомая энцыклапедыя Ф.А. Бракгаўза і І.А. Эфрона – «Энцыклапедычны слоўнік» у 86 тамах, надрукаваны ў 1890–1907 г., а таксама выданне з той жа назвай братоў Гранат). Пасля перамогі Кастрычніка і трывалага ўсталявання новай улады паўстала задача стварэння іх новага савецкага варыянта. 13 лютага 1925 г. пастановай ЦК УКП(б) і ЦВК СССР створана акцыянернае таварыства «Дзяржаўнае навуковае выдавецтва «Савецкая энцыклапедыя», якое распачала падрыхтоўку да першага выдання «Вялікай савецкай энцыклапедыі», першыя кнігі якой сталі выходзіць з друку ў 1926 г. Роўналежна з ёй у 1928–1931 гг. ажыццяўлялася першае выданне «Малой савецкай энцыклапедыі» у 10 тамах.

У паслякастрычніцкі перыяд розныя захады па фарміраванні навуковага комплексу ў БССР праводзілася даволі часта паводле прыкладу, які давала РСФСР з улікам мясцовых асаблівасцяў, абумоўленых станам кадравага патэнцыялу, наяўнай сістэмай навукова-даследчых устаноў, узроўнем, геаграфіяй і накірункамі вышэйшай адукацыі і г.д. У выніку многія мерапрыемствы гэтага кшталту ажыццяўляліся ў рэспубліцы з некаторым спазненнем. Нягледзячы на такое перайманне, расійскі прыклад часта дабратворна ўплываў на развіццё інтэлектуальнай сітуацыі ў Беларусі.

Напрыклад, БелАН спрабавала ў канцы 1920-х гадоў стварыць сваю энцыклапедыю, праўда, толькі літаратурную. Гэта і зразумела. Менавіта ў 1920-я гады адбыўся «выбух» літаратурнай творчасці. Пісьменнікі і паэты выконвалі не толькі чыста мастацкую функцыю. Яны адыгрывалі важную ролю ў навуковым, грамадскім жыцці, у працэсах сцвярджэння беларусаў як нацыі. Ужо да вясны 1929 г. працавала рэдкалегія Літаратурнай энцыклапедыі. Увогуле, яе праобразам можна лічыць камісію для складання біяграфічнага слоўніка пісьменнікаў, якая дзейнічала ў складзе Інбелкульта. Але, сутыкнуўшыся з такой аб'ёмнай і цяжкай для навуковага выканання справай, члены Прэзідыума БАН зразумелі, што сваімі сіламі Акадэмія з напісаннем энцыклапедыі не справіцца. Таму 7 мая 1929 г. яны вырашалі прасіць Наркамат асветы

стварыць адпаведную агульнарэспубліканскую камісію. Апошняя, на думку Ў.М. Ігнатоўскага, М.І. Бялугі, С.М. Некрашэвіча, В.Ю. Ластоўскага, П.В. Трамповіча, павінна будзе скласці спіс пісьменнікаў для ўключэння ў энцыклапедыю, узяць на сябе вырашэнне арганізацыйных пытанняў і рэдагаванне матэрыялаў. Прапаноўвалася ўвесці ў склад камісіі прадстаўнікоў «кафедры літаратурнай камісіі» (кафедры гісторыі беларускай літаратуры з камісіяй па выданні твораў беларускіх пісьменнікаў) БАН, літаратурнай секцыі навуковага таварыства БДУ, Таварыства марксістаў, пісьменніцкіх аб’яднанняў «Полымя», «Узвышша», БелАПП [8, арк. 51–52]. Падзеі, якія пачалі неўзабаве разгортвацца ў СССР і ў тым ліку ў БССР, не спрыялі рэалізацыі пастаўленай мэты.

Пазней, пасля змены палітычнай сітуацыі ў краіне і кіраўніцтве БАН, «энцыклапедычныя» задачы фармуляваліся ў іншым, больш шырокім, рэчышчы. Так, 15 верасня 1931 г. Прэзідыум Беларускай Акадэміі навук заслухаў комплексную інфармацыю П.Я. Панкевіча аб стварэнні камісіі для рэцэнзавання матэрыялаў пра БССР, якія змяшчаліся ў розных энцыклапедычных выданнях СССР, а таксама аб «падрыхтоўцы выдання Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». У выніку было прынятае рашэнне стварыць «тройку» ў складзе П.В. Горына, П.Я. Панкевіча і А.А. Сянкевіча, якой даручалася на працягу двух тыдняў падрыхтаваць свае прапановы [9, арк. 42]. Думаецца, дадзенае рашэнне не было выключна ініцыятывай Акадэміі. На гэта ўказвае тагачасная тэндэнцыя ўзмацнення аднаасобнага кіраўніцтва ў навуцы (у дадзеным выпадку П.В. Горына як Прэзідэнта БАН), а таксама тое, што апошні фактычна з’яўляўся «рукой партыі» ў беларускай акадэмічнай навуцы пасля падзей 1930 г. («Саюз вызвалення Беларусі»). Такім чынам, вынікі паседжання 15 верасня можна разглядаць як партыйны «зандаж» магчымасці выканання адказнай задачы, пастаўленай у новых палітычных і навукова-арганізацыйных умовах.

У.М. Міхнюк у 1985 г. пісаў, што ў выніку пастановы сакавіцкага (1932 г.) аб’яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б разгарнулася праца па стварэнні БелСЭ [3, с. 70]. Канкрэтнае рашэнне бюро ЦК КП(б)Б ужо аб выданні першага тома ў 1934 г. мела месца 21 красавіка таго ж года. Галоўным рэдактарам быў прызначаны Прэзідэнт БАН П.В. Горын, намеснікамі – Ц.Л. Бурстын, Т.Ф. Домбаль, М.Л. Мешчаракоў, В.К. Шчарбакоў. Усяго ў склад рэдакцыйнага савета БСЭ ЦК рэспубліканскай партыйнай арганізацыі прызначыў 26 чалавек [5].

У тым жа 1934 г. справаздача Акадэміі навук, падрыхтаваная да XIV з’езда Саветаў БССР, паведамляла пра разгорнутую працу па падрыхтоўцы першых тамоў энцыклапедыі на літары «А» і «Б». Адбыліся некаторыя кадравыя змены: у склад намеснікаў замест В.К. Шчарбакова ўведзены С.Я. Вальфсон (відаць, у сувязі з паспяховым выкананнем задачы па разгрому беларускіх «нацдэмаў»). Меркавалася, што Беларуская савецкая энцыклапедыя будзе прадстаўляць звесткі па ўсіх галінах ведаў, надаючы асаблівую ўвагу пытанням гісторыі, гаспадаркі і культуры Беларусі. Аб’ём выдання вызначаўся ў 10 тамоў, якія павінны былі ўтрымліваць 45 000 тэрмінаў і складацца з агульнай колькасці 3 млн. 200 тыс. слоў, што пацвярджалася і ў 1935 г. Да ўдзелу ў працы былі прыцягнутыя 200 вучоных, прычым не толькі з БССР, але і з іншых рэспублік Савецкага Саюза [10, арк. 29]. Неўзабаве, 29 мая 1936 г., склад галоўнай рэдакцыі быў зменены. Галоўным рэдактарам зацверджаны новы Прэзідэнт Акадэміі навук І.З. Сурта, яго намеснікам – С.Я. Вальфсон, членамі рэдакцыі – М.Ф. Гікала, Д.І. Валковіч, М.М. Галадзед, Д.Ю. Конік, А.Р. Чарвякоў, А.І. Дзякаў [5].

Дакладная запіска С.Я. Вальфсона «Кароткія звесткі па выданні БелСЭ», пасланая ў ЦК КП(б)Б 27 мая 1936 г., паведамляла ўжо пра 43 000 запланаваных

тэрмінаў для змяшчэння ў энцыклапедыі і 16 тэматычных слоўніках, што ўяўляла сабой першы вопыт у выданні слоўнікаў падобнага кшталту. Хаця у 1935 г. паведамлялася пра выпуск 49 слоўнікаў, у тым ліку 26 – па сацыяльных і гуманітарных галінах ведаў [12]. У прыватнасці, пабачылі свет слоўнікі па ўсеагульнай гісторыі, археалогіі і антрапалогіі, гісторыі Беларусі, Расіі, народаў СССР, Усходу, міфалогіі, мовазнаўстве, філасофіі, найноўшай гісторыі і сучаснай палітыцы Захаду, па беларускай, польскай, латышскай, літоўскай, яўрэйскай літаратурах і інш. [11–14]. Пры змяншэнні колькасці артыкулаў значна павялічыўся аўтарскі склад, прыцягнуты да ўдзелу ў напісанні БСЭ да 450 чалавек, сярод якіх «буйныя вучоныя СССР, БССР і наш навуковы маладняк». Першы том з 3 002 артыкуламі быў здадзены ў набор у снежні 1935 г. Але Прэзідыум БАН абавязаў выдавецтва Акадэміі, відавочна, ў чарговы раз «прыступіць да набору» толькі 15 красавіка 1936 г. [15, арк. 40]. Адначасова праводзілася праца па падрыхтоўцы другога тома, 82 % якой было завершана. Тым не менш Прэзідыум Акадэміі навук 3 мая 1937 г. усё яшчэ прапаноўваў «скончыць вёрстку тэксту» да 7 мая гэтага года [16, арк. 56].

Усплёск цікавасці да становішча БелСЭ ініцыяваны быў, верагодна, артыкулам «Забытае рашэнне» ў цэнтральным партыйным друкаваным органе газеце «Правда», апублікаваным 21 сакавіка 1937 г. (невялікая крытычная нататка, змешчаная на апошняй старонцы). У выніку сітуацыя з выданнем стала прадметам абмеркавання на пасяджэнні СНК БССР 8–9 красавіка 1937 г. Газетная крытыка прызнана правільнай, а пастанова скончыць друкаванне першага тому да 11 ліпеня 1937 г. [17, арк. 206] амаль праз месяц прынята да выканання Прэзідыумам Акадэміі навук.

У дадзеным выпадку мы пакінем па-за ўвагай сцвярджэнні аўтараў артыкула ў «Советской Беларуси» пра акадэміка АН БССР С.Я. Вальфсона як «наіўную душу», пра тое, што ён спрабаваў «пажаліцца калегам на цэнзурныя цяжкасці» (С.Я. Вальфсон – аўтар большасці тэкстаў і кіраўнік брыгады кафедры марксізму-ленінізму БАН па напісанні сумнавядомай «Навукі» на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі» і іншых падобнага кшталту пагромных публікацый на працягу 1930-х гадоў – І.Ш.). Наадварот, ён з з пачуццём выкананага абавязку і бальшавіцкім задорам інфармуе і калег, і ЦК: кожны артыкул праходзіць мінімум праз 4 інстанцыі, у большасці выпадкаў колькасць інстанцый даходзіць да 6–7. Меліся выпадкі, што патрабавалася трох- і чатырохразовая праўка артыкула [5; 18, арк. 110]. Гэтыя выказванні, як і сцвярджэнні пра «сівавалосых акадэмікаў» (сярэдні ўзрост акадэмікаў на момант арышту ці скасавання галоўнай рэдакцыі БСЭ складаў прыблізна 50 гадоў [19]); пра разгортванне першых палітычных працэсаў «над ворагамі народа» з 1937 г. (у 2002 г. было добра вядома, што першым масавым палітычным працэсам у БССР стаў у 1930 г. «Саюз вызвалення Беларусі», што ў РСФСР і УССР такія мерапрыемствы ажыццяўляліся яшчэ раней), можна аднесці на конт журналісцкай схільнасці да прыгожай фразы і ёмістага слова.

Аднак катэгарычнае сцверджанне пра рэпрэсіі як адзіную прычыну спынення выдання БелСЭ патрабуе да сябе больш шчыльнай ўвагі. І без рэпрэсій колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў у БССР была невялікай. Так, да канца 1927 г. рэспубліка налічвала 403 навукоўца [20, с. 29], на пачатку 1931 г. – 734 (11 акадэмікаў, 104 прафесары, 92 дацэнты, 66 вучоных спецыялістаў, 155 навуковых супрацоўнікаў, 306 асістэнтаў). З іх усіх 300 чалавек мелі сярэднюю і два ніжэйшую адукацыю [21, с. 36]. У апошнім годзе першай пяцігодкі ва ўсіх НДУ не хапала, па «сціплых» падліках, каля 500 навуковых работнікаў [22]. Дайшло да скарачэння фонду зарплаты 1931 і 1932 гг., абумоўленага часовым некамплектам штатаў

1931 года [23, арк. 85адв.]. Яшчэ ў 1928 г. пры планаванні падрыхтоўкі навуковых кадраў іх рост за пяцігодку прадугледжваўся з 598 да 2 120 чалавек і да 3 300 у 1935/36 г. [24, арк. 103]. Аднак у канцы 1932 г. колькасць вучоных вырасла толькі да 1 600 [20, с. 31], на пачатку 1935 г. паменшала да 1 358 [25], а ў 1938 г. склала 1 263 навуковых і навукова-педагагічных работніка [26, с. 123].

Зразумела, вялікі адбітак на дадзенае становішча рабілі рэпрэсіі. Так, толькі ў першай палове 1933 г. у акадэмічным Інстытуце гісторыі звольнілі 5 чалавек, Інстытуце мовазнаўства, Інстытуце літаратуры і мастацтва, Інстытуце філасофіі – па 4, яўрэйскім і польскім інстытутах – адпаведна 3 і 1, яшчэ 23 – з іншых інстытутаў [27, арк. 2]. У спісе арыштаваных у 1936 г. зафіксавана 18 чалавек па ўсіх спецыяльнасцях; за першыя шэсць месяцаў 1937 г. – 8 [28, арк. 3]. Увосень 1936 г. прэзідэнт Акадэміі інфармаваў ЦК КП(б)Б: «Між іншым, становішча з работнікамі ў інстытутах філасофіі і права, эканомікі, літаратуры, гісторыі такое, што хоць зачыняй іх усе» [29, арк. 240адв.].

Такая самая сітуацыя назіралася і ў Інстытуце гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі, які з сярэдзіны 1930-х гадоў губляе свае кадры: у 1934 г. у ім працавалі 20 штатных навуковых работнікаў, у 1936 г. – 11, у 1938 г. – 2 малодшых навуковых супрацоўнікі. Толькі за 1937 г. у ІГПКР арыштавалі 7 чалавек і звалілі з працы 3 [30, арк. 3; 31, арк. 4; 32, арк. 2–3, 6–8]. У той самы час у Акадэміі навук праяўляецца іншая тэндэнцыя. Калі ў 1933 г. у БАН на працу прынятыя 72 навуковых работнікі, а звольненыя па розных прычынах 84, то ў наступным годзе – адпаведна 43 і 9 [33, арк. 92].

Палітычныя калізіі таго часу не спрыялі найбольш поўнаму раскрыццю інтэлектуальнага патэнцыялу вучоных. Ужо ў 1931 г. В.К. Шчарбакоў пісаў: «Частка навуковых працаўнікоў не даюць прадукцыі ад страху: як бы не зрабіць вялікіх метадалагічных і гістарычных памылак... Частка найбольш рэакцыйных навуковых працаўнікоў проста ня хочуць пісаць і ня пішуць» [21, с. 39]. Такую ж сітуацыю праз два гады зафіксавала рашэнне Прэзідыума БАН. Разглядаючы ў 1933 г. дзейнасць Інстытута гісторыі, пастанова адзначыла недапушчальнасць пазіцыі супрацоўнікаў, калі «яны на працягу апошняга года амаль зусім не займаліся навуковай работай, што аб'ектыўна можна разглядаць як праяву правага апартунізму» [34, арк. 36]. Скарэктаваў працу і 1937 год з яго палітычнымі правіламі. Пасля арышту прэзідэнта АН БССР і галоўнага рэдактара БелСэ І. Сурты ў партыйных дакументах увесь час пры разглядзе пытання аб энцыклапедыі фігуруе фраза аб ворагах народа ў наступным выглядзе: «Сурта і інш.»

Такім чынам, зразумелая маральная спустошанасць вучоных, абумоўленая рэпрэсіямі, не спрыяла актывізацыі іх творчай актыўнасці ў 1930-я гады. Разам з тым наяўнасць 1 263 навукоўцаў у 1938 г., магчымасць прыцягнення аўтараў з іншых рэгіёнаў СССР, адпаведныя тэарэтычныя ўказанні саюзных партыйных органаў уяўлялі неабходную аснову для стварэння Беларускай савецкай энцыклапедыі паводле прыклада, дадзенага першым і другім выданнямі Малой савецкай энцыклапедыі, працягам публікацыі Вялікай савецкай энцыклапедыі. Для гэтага выдзялялася і неблагое фінансаванне. Толькі на першы том было выдаткавана 312 тыс. рублёў (разам з 1937 г.), а з падпіскі атрымана толькі 26 тыс. руб., нягледзячы на тое, што выданне меркавалася ажыццявіць на прынцыпе гаспадарчага разліку*. Іншая справа, пры экспертызе высвятлілася: яго змест уяўляе сабой пераклад на беларускую мову першага

* Пасля павышэння зарплаты акадэмічным работнікам пастановай СНК БССР «Аб стаўках заработнай платы правадзейным членам, членам-карэспандэнтам і навуковым работнікам АН БССР» (16 мая 1937 г.) дырэктар інстытута атрымліваў на месяц 1 000–1 500 руб., кіраўнік аддзела, сектара і г.д. – 600–1 200 руб.; старэйшы навуковы супрацоўнік і спецыяльны аспірант (дактарант) – да 750 руб. [35, с. 94].

тома Малой савецкай энцыклапедыі, а ўласна беларускія матэрыялы складаюць менш за 20 % [36, арк. 75], што і было зафіксавана ў падрыхтоўчых матэрыялах да адпаведнай партыйнай пастановы.

10 лістапада 1937 г. ЦК КП(б)Б вырашыў спыніць працы па *выданні* (курсіў наш – І.Ш.) энцыклапедыі. Адначасова пастанова інфармавала аб тым, што «зараз ідзе выключэнне з тому артыкулаў, напісаных ворагамі народа, і артыкулаў, прысвечаных ворагам народа» [37, арк. 388]. Выходзіць, ЦК на той момант канчаткова не вызначыўся з пытаннем аб ліквідацыі галоўнай рэдакцыі БСЭ.

Такім чынам, для ажыццяўлення запланаванай працы па стварэнні Беларускай савецкай энцыклапедыі ў 10 тамах меліся і кадры, і фінансаванне, і паліграфічная база. Адмоўна ўплывалі на рэалізацыю дадзенага праекта палітычная сітуацыя (рэпрэсіі ў дачыненні да вучоных) і абумоўленыя гэтым боязь не трапіць ва ўнісон з партыйнай лініяй і вытворная з гэтага творчая апатыя даследчыкаў. Палітычныя прычыны, абумоўленыя імі ўніфікацыя (на падставе расійскага фактара) навуковага і культурнага жыцця, прыніжэнне ролі ў ім беларускага чынніка, фінансавыя праблемы (выданне не акуплялася), маральнае самаадчуванне навуковай інтэлігенцыі, яе невысокі кваліфікацыйны ўзровень спрычыніліся да ліквідацыі рэдакцыі БелСЭ 5 снежня 1937 г. [38, арк. 39] зусім не ў меншай ступені, чым рэпрэсіі.

Апеляцыя прадстаўнікоў высокіх партыйных органаў да пачуцця нацыянальнага гонару, у тым ліку і беларускага народа, з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, мяняе пазіцыі кантралюючых ідэалагічных інстанцый і да зместу, і да накірункаў даследчыцкай праблематыкі. У гэтым рэчышчы адным з найважнейшых відаў працы з 1943 г. планавалася напісанне артыкулаў для беларускай энцыклапедыі («Кароткая энцыклапедыя БССР»). Аб’ём вызначаўся ў некалькі тысяч артыкулаў. Для выканання задання прадугледжвалася прыцягненне ўсяго кадравага складу Аддзялення грамадскіх навук і ў асобных выпадках даследчыкаў па дамове. Адказнымі кіраўнікамі прызначаліся акадэмікі АН БССР У.В. Перцаў і У.І. Пічэта (гісторыя), В.С. Нямчынаў і В.М. Лубяка (эканоміка), члены-карэспандэнты АН БССР М.Ц. Лынькоў і К.К. Крапіва (літаратура), прафесар Ц.П. Ломцеў (мова). Арганізацыя працы па стварэнні энцыклапедыі матывавалася неабходнасцю азнаямлення грамадскасці з дзеячамі беларускай культуры, гісторыі, літаратуры, мовы, эканомікі, цэнтрамі Беларусі, якія маюць гістарычнае значэнне, з помнікамі культуры і гісторыі народа, археалагічнымі знаходкамі, этнаграфіяй і ўсім тым, што мела і мае дачыненне да эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і духоўнага жыцця беларускага народа [39, арк. 5адв.].

Нягледзячы на прынятыя рашэнні, у 1944 г. адпаведныя заданні інстытутамі (групамі) гісторыі, літаратуры, мовы і мастацтва («Распрацоўка асобных артыкулаў для Беларускай энцыклапедыі па Аддзелу гуманітарных навук і мастацкай творчасці»), эканомікі («Распрацоўка артыкулаў Энцыклапедыі БССР па эканоміцы прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарту») не выконваліся і былі зняты з плана работ з прычыны адсутнасці патрэбнай колькасці выканаўцаў [40, арк. 6 адв., 10].

Такім чынам, другая спроба стварэння беларускай нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі зноў скончылася няўдачай, а яе рэалізацыя была адкладзена яшчэ на дваццаць пяць гадоў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская энцыклапедыя // Беларусь: энцыкл. даведнік ; рэд. калегія : Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1995. – С. 99.
2. Хаўратовіч, І.П. Беларуская энцыклапедыя / І.П. Хаўратовіч // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 423.
3. Михнюк, В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В.Н. Михнюк ; под ред П.Т. Петрикова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 286 с.
4. Саламаха, У. Пашпарт краіны, альбо Глядзі энцыклапедыю / У. Саламаха [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://21.by/u.php?u=http://zvyazda.minsk.by/ru/issue/article.php?id=41105. – Дата доступу: 20.03.2010.
5. Селяменеў, В. Энцыклапедыя, якой не было / В. Селяменеў, Л. Селіцкая [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://bynotes.ru/page/encyklapedyja-jakoj-ne-bylo. – Дата доступу: 08.03.2007.
6. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.
7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
8. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Фонд. 1. – Спр. 2. Протоколы заседаний Президиума АН БССР (1929 г.).
9. ЦНА НАНБ. – Фонд. 1. – Спр. 8. Протоколы заседаний и другая переписка Президиума АН БССР (1931 г.).
10. ЦНА НАНБ. – Фонд. 1. – Спр. 29. Отчёт АН БССР к XI съезду Советов БССР (1934 г.).
11. Сусветная літаратура. Праект слоўніка. – Менск : Выд-ва Беларус. Акад. Навук. – Вып. III. – 86 сл.
12. Мовазнаўства. Праект слоўніка. – Менск : Выд-ва Беларус. Акад. Навук, 1935. – Вып. IV. – 22 сл.
13. Усеагульная гісторыя. Праект слоўніка.– Менск : Выд-ва Беларус. Акад. Навук. – Вып. VII. – 218 сл.
14. Археалогія, антрапалогія. Праект слоўніка. – Менск : Выд-ва Беларус. Акад. Навук. – Вып.VIII. –38 сл.
15. ЦНА НАНБ. – Фонд. 1. – Спр. 50. Протоколы заседаний Президиума АН БССР (1936 г.).
16. ЦНА НАНБ. – Фонд. 1. – Спр. 53. Т. 1. Протоколы заседаний Президиума АН БССР и выписки из протоколов АН БССР (1937 г.).
17. ЦНА НАНБ. – Фонд. 1. – Спр. 38. Постановления СНК БССР (1936 г.).
18. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9154. Протокол № 185 заседания бюро ЦК КП(б)Б от 29 мая 1936 г., документы к нему.
19. Национальная Академия наук Беларуси. Персональный состав. 1928–2003 / сост.: О.А. Гапоненко [и др.]; редкол. : Н.А. Борисевич [и др.]. – 3-е изд., доп. и перераб. – Минск : БелЭн, 2003. – 336 с.
20. Вальфсон, С.Я. Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні: культурнае будаўніцтва БССР да XV-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі / С.Я. Вальфсон. – Мінск : ДВБ, 1932. – 46 с.

21. Шчарбакоў, В. Праблема навуковых кадраў у БССР / В. Шчарбакоў // Савецкая краіна. – 1931. – № 1. – С. 33–41.

22. Горин, П. Научно-исследовательская работа БССР во 2-й пятилетке / П. Горин // Рабочий. – 1932. – 1 июня. – С. 2–3.

23. НАРБ. – Фонд 93. – Воп. 1. – Спр. 8349. Постановление коллегии Наркомзема БССР от 10 октября 1933 г. об организации районных колхозных школ, сметы расходов Наркомюста БССР, библиотек и музеев на 1933 г.

24. НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 1949. Планы работы, учебные планы, объяснительные записки к ним и сведения о составе научных сотрудников научно-исследовательских учреждений и вузов, подведомственных Наркомпросу на 1929–30 г.

25. Открылась сессия академии наук БССР // Рабочий. – 1935. – 8 янв. – С. 1.

26. Кіселёў, К. Трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі / К. Кіселёў // Бальшавік Беларусі. – 1938. – № 11–12. – С. 118–125.

27. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6994. Докладная записка отдела культуры и пропаганды ЦК КП(б)Б секретарю Н.Ф. Гикало от 23 марта 1933 г. о допущенных перегибах при увольнении ряда научных сотрудников отдельных вузов БССР и институтов Белорусской академии наук, заявления ўволенных о несогласии со снятием с работы.

28. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11875. Справки о структуре и состоянии научных кадров Академии наук БССР, пересмотре сети польских школ, результатах проведении аттестации учителей школ в БССР, учебные планы городских и сельских школ, сведения о сети школ приграничных районов БССР. 19–22 июля 1937 г.

29. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10870. Докладные записки о состоянии колхозной торговли в БССР, необходимости реорганизации ряда польских школ Дзержинского района в белорусские, потребности в руководящих партийных кадрах по системе Белорусского ўправления связи, Днепро-Двинского речного пароходства, Лесбела и др. 2 января – 26 декабря 1936 г.

30. НАРБ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 217. Статистический отчёт Института [ІГПКР] за 1934 год. 27.03.1935.

31. НАРБ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 257. Отчёт о работе [ІГПКР] за 1936 г.

32. НАРБ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 305. Списки сотрудников [ІГПКР] и характеристики на них. Автобиографии сотрудников партархива. Список горкомов и райкомов КП(б)Б, подлежащих к сдаче документов в партархив и переписка. 4.01 – 22.07.1938 г.

33. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6902. Постановления и протоколы заседаний бюро и секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. 6 ноября 1933 г. – 4 июля 1935 г.

34. ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 21а. Стенограммы заседаний Президиума и другая переписка, протоколы заседания Президиума АН БССР (1933 г.).

35. Шаўчук, І.І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І.І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ, 2007. – 279 с.

36. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12007. Протоколы заседаний парткома и общего собрания коммунистов первичной парторганизации Белорусского государственного лесотехнического института им. Кирова, отчёт парткома института о работе с 9 марта 1935 г. по 1 апреля 1937 г., докладные записки о работе и мерах по ликвидации вредительской деятельности, наличии компрометирующих данных на отдельных работников Академии наук БССР, Института истории партии при ЦК

КП(б)Б, Белгосуниверситета, Белорусского государственного лесотехнического института им. Кирова, акт обследования работы санитарно-химической лаборатории Наркомзема БССР от 16 ноября 1937 г. 3 апреля 1937 г. – 27 декабря 1938 г.

37. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11045. Протокол № 26 заседания бюро ЦК КП(б)Б, документы к нему.

38. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13219. Докладные записки НКВД БССР в ЦК ВКП(б) о наличии классово-чуждых элементов и фактах вредительства в системе Наркомпроса и Академии наук БССР, антисоветской деятельности церковников и сектантов в БССР (пересланы из ЦК ВКП(б) в ЦК КП(б)Б 7 июля 1938 г.). 21–25 июня 1938 г.

39. ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 91. Планы научно-исследовательских работ Академии наук БССР. Отделение общественных наук. На 1944 г.

40. ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 92. Отчёт о научной деятельности Академии наук Белорусской ССР за 1944 г.

***Shauchuk I.* Concerning the History of Belarusian Soviet Encyclopedia Creation**

The paper deals with the problem of the national encyclopedia publication efforts resulted in no success at that time. The question is very important from viewpoint of the BSSR science and cultural development. It is studied on the basis of the published materials and archival sources that have not been put into scientific circulation. For the first time the reasons of failures are defined as caused not so mach by political repressions, the beginning Great Patriotic War as by other factors and first of all by inexpedience (motivated by economic and political reasons) for encyclopedia publication in the realities of 1930s.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 30.05.2011